**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”**
Факультэт беларускай філалогіі і культуры
Кафедра беларускага мовазнаўства

**Хруцкая**
**Зоя Станіславаўна**

# Эліптычныя канструкцыі ў трылогіі Івана Мележа “Палеская хроніка”

**Дыпломнае даследаванне**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Навуковы кіраўнік –**
**кандыдат філалагічных навук,**
**дацэнт Чайка Н.У.**

**Мінск, 2012**

## Анатацыя

Дыпломная праца прысвечана даследаванню эліптычных канструкцый у мастацкіх творах І. Мележа. У дыпломным даследаванні робіцца агляд мовазнаўчых школ і напрамкаў, якія распрацоўвалі пытанне пра эліптычныя канструкцыі на працягу гісторыі мовазнаўства, – логіка-граматычны, структурны, семантычны і інш. У працы аналізуецца семантычная арганізацыя канструкцый з эліпсісам дзеяслова, вызначаецца асноўныя семантычныя тыпы – семантыка руху, перамяшчэння ў прасторы, актыўнага дзеяння, маўленчых працэсаў. Выяўлены спосабы выражэння семантычных кампанентаў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова.

У дыпломнай працы даследуецца структурная арганізацыя канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Выяўлены галоўныя і даданыя члены сказа, суадносныя са склонавымі формамі назоўнікаў, з беспрыназоўнікавымі формамі назоўнікаў, са склонавымі формамі прыметнікаў, са склонавымі формамі займеннікаў, суадносныя з прыслоўямі. Вызначаны спосабы і сродкі пашырэння сінтаксічнай структуры сказа канструкцый з эліпсісам дзеяслова – аднародныя выказнікі, адасобленыя акалічнасці і азначэнні, параўнальныя звароты. Выяўлены з'явы эліпсіса на ўзроўні складанага сказа і складанага сінтаксічнага цэлага. Пры гэтым вызначаюцца сродкі выражэння структурных відаў канструкцый з эліпсісам дзеяслова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ